УДК 9(476+474.5)“1920”

## Савецка-літоўскі мірны дагавор 12 ліпеня 1920 г.

Багалейша С. В.
Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт

Беларускія этнічныя тэрыторыі не аднойчы падвяргаліся захопам і падзелам з боку суседзяў. Чарговы падзел беларускіх зямель адбыўся ў выніку падпісання мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Літвой. Гэты дагавор – з’ява цікавая і складаная, і на сённяшні дзень патрабуе дэталёвага даследавання.

11 верасня 1919 г. урад РСФСР звярнуўся да ўрада Літвы з прапановай заключыць мір на аснове прызнання незалежнасці літоўскай дзяржавы. 31 сакавіка 1920 г. урад Літвы выказаў гатоўнасць заключыць мір з Савецкай Расіяй пры ўмове не толькі прызнання незалежнасці Літвы, але і прызнання яе дзяржаўнасці ў граніцах Віленшчыны (са сталіцай Вільна) і Гродзеншчыны, дзе літоўскае насельніцтва складала меншасць. 7 мая 1920 г. у Маскве пачаліся мірныя перагаворы. У самым пачатку іх літоўская дэлегацыя выставіла максімальныя патрабаванні – далучыць да Літвы Ковенскую, Віленскую, Сувалкаўскую і Гродзенскую губерні, а таксама Навагрудскі ўезд Мінскай губерні. Па гэтай прычыне перамовы зацягваліся. Аднак ва ўмовах падрыхтоўкі да актыўных баявых дзеянняў супраць Польшчы савецкі бок вырашыў саступіць і ў ліпені 1920 г. паскорыў ход перагавораў з Літвой, даўшы згоду на максімальнае задавальненне тэрытарыяльных патрабаванняў літоўцаў. У выніку дагавор быў падпісаны 12 ліпеня 1920 г. і складаўся з 19 артыкулаў. Савецкі ўрад безагаворачна прызнаў самастойнасць і незалежнасць літоўскай дзяржавы, а Вільню і суседнія з ёй тэрыторыі (з Лідай і Гродна) – неад’емнай часткай Літвы. Абодва бакі абавязваліся не дапускаць выкарыстання сваіх тэрыторый для ваенных прыгатаванняў, накіраваных супраць адзін аднаго. Некалькі артыкулаў дагавора датычыліся эканамічнага і культурнага супрацоўніцтва паміж Літвой і Расіяй. На аснове палажэнняў дагавора ўрад РСФСР 27 жніўня 1920 г. перадаў Літве Вільню, і ў сувязі з гэтым была падпісана спецыяльная канвенцыя аб вывадзе савецкіх войск з літоўскай тэрыторыі.

Літва стала другой пасля Эстоніі некамуністычнай дзяржавай, якая ўстанавіла з Савецкай Расіяй поўнасцю юрыдычна аформленыя дыпламатычныя адносіны. Савецка-літоўскі мірны дагавор 12 ліпеня 1920 г. значна палепшыў міжнароднае становішча Літвы, бо юрыдычна замацаваў факт яе аддзялення ад Расіі і стварыў юрыдычную аснову для яе прэтэнзій на Вільню і частку беларускіх зямель.